***Свірыдзенка В. І.**, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэт імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Цірынава В. І.**, дактарант Акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Буквар. I клас. Змены ў змесце вучэбнага дапаможніка для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

У 2024/2025 навучальным годзе навучанне грамаце ў I класе ўстаноў адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання будзе арганізавана з выкарыстаннем наступнага вучэбнага дапаможніка:

Свірыдзенка, В. І. Буквар : вучэб. дапам. для 1-га кл. установ адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. — 2-е выд., перагледж. і дап. — Мінск : Акадэмія адукацыі, 2024.

Вучэбны дапаможнік дапрацаваны па выніках вопытнай праверкі, праведзенай у 2021/2022 навучальным годзе, а таксама па прапановах настаўнікаў — удзельнікаў дыялогавай пляцоўкі «Якасць вучэбных дапаможнікаў па вучэбных прадметах для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі», якая адбылася 6 ліпеня 2022 г. у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

У змест вучэбнага дапаможніка ўнесены шэраг змен.

1. Абноўлены пералік умоўных абазначэнняў з мэтай рэалізацыі адзіных патрабаванняў да структуры і навігацыйнага апарату ў вучэбных выданнях для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі (мал. 1).




*Малюнак 1* — Умоўныя абазначэнні буквара

2. Зменшаны аб'ём некаторых тэкстаў для чытання. Скарэкціраваны ілюстрацыйны матэрыял вучэбнага выдання.

3. З мэтай фарміравання гістарычнай памяці ў змест вучэбнага дапаможніка ўключаны QR-код з доступам да анімацыйнага фільма «Піліпка», які створаны Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм» (рэжысёр и мастак-пастаноўшчык Т. В. Кубліцкая) па матывах беларускіх народных казак.

4. Дапрацаваны графічныя арыенціры для чытання. Дадаткова выдзелены чырвоным колерам літары галосных у шматскладовых словах для больш лёгкага арыентавання ў іх графічнай структуры. Павялічана колькасць слоў, падзеленых для склады.

5. Заменена або скарэкціравана невялікая частка дыдактычнага матэрыялу, які прадстаўлены словамі, тэкстамі, малюнкамі. Новы матэрыял адабраны з улікам мэт і задач навучання і з захаваннем папярэдняй тэматыкі.

6. Дабаўлены матэрыялы для падагульнення вывучанага за год: с. 182–183 вучэбнага выдання (мал. 2).

Змены ў змесце вучэбнага дапаможніка знайшлі адлюстраванне ў каляндарна-тэматычным планаванні па вучэбным прадмеце «Навучанне грамаце (навучанне чытанню)» (2024/2025 навучальны год).

Спынімся больш падрабязна на зменах у дыдактычным матэрыяле вучэбнага дапаможніка і дадзім некаторыя метадычныя каментарыі.

<u>Урок 1.</u> Маўленне вуснае і пісьмовае. Знаёмства з букварам.

На с. 5 буквара зменена ілюстрацыя для пастаноўкі праблемнага пытання (мал. 3).

Настаўнік паведамляе, што людзі могуць уступаць у зносіны не толькі пры дапамозе маўлення. Ён прапаноўвае вучням разгледзець малюнкі, змешчаныя ўнізе буквара (мал. 3). Вучні апісваюць адлюстраваныя на малюнках сітуацыі: мама выпраўляе дзяцей у школу; тата трымае на руках немаўля. Настаўнік запытваецца:

— Ці разумеюць людзі адзін аднаго? *(Так.)* Што дапамагае людзям уступаць у зносіны без выкарыстання вуснага або пісьмовага маўлення? Напрыклад, немаўля яшчэ не ўмее размаўляць. *(Людзям*



Чаму мы навучыліся? Правер сябе!

Прачытай, дапоўні сказ.

Я ведаю, што гукі мы чуем і ... .

Я ведаю, што літары мы пішам і ... .

Я ведаю, што гукі бываюць галосныя і ... .

Я ведаю, што зычныя гукі бываюць цвёрдыя і ... .

Я ведаю, што зычныя гукі бываюць звонкія і ... .

Я ведаю, што ўсе літары, якія стаяць у патрэбным парадку, — гэта ... .



Падумай і адкажы.

Якая літара не абазначае гукаў?

Якія літары ў пачатку слова абазначаюць два гукі?

Якія літары заўсёды маленькія?

Якія літары абазначаюць толькі цвёрды гук?

Якая літара абазначае толькі мяккі гук?

Выразна прачытай сказы. Звярні ўвагу на знакі прыпынку ў канцы. Вылучай голасам патрэбныя словы.

Мы навучыліся чытаць.
Мы навучыліся чытаць?
Мы навучыліся чытаць!

182 183

*Малюнак 2* — Заданні для падагульнення вывучанага



*Малюнак 3* — Заданне для пастаноўкі праблемнага пытання

*дапамагаюць жэсты рукамі, выраз твару, напрыклад усмешка адзін аднаму.)* У якіх яшчэ сітуацыях могуць спатрэбіцца іншыя спосабы зносін? *(Жыхар іншай краіны не ведае вашай мовы, па нейкай прычыне нельга размаўляць і г. д.)*

<u>Урок 4.</u> Слова, яго значэнне.

На с. 11 буквара зменена ілюстрацыя для арганізацыі назірання за работай слоў (мал. 4). Работа з прадметнымі малюнкамі (кубак, ключ, месяц, зорка) і схемамі на старонках буквара арганізуецца па пытаннях:

— Як вы думаеце, ці можна адным і тым жа словам назваць розныя прадметы? Папрацуем са словамі, каб даведацца пра гэта.



*Малюнак 4* — Заданне для назірання за работай слоў

— Што намалявана? Гэта розныя прадметы? Словы гучаць аднолькава ці па-рознаму? Хто ведае яшчэ такія словы? Які вывад можна зрабіць?

Вывад: адным словам могуць называцца розныя прадметы.

<u>Урок 5.</u> Словы — назвы прадметаў, іх прымет і дзеянняў.

На с. 12 буквара зменена ілюстрацыя для гульні «Чым адрозніваюцца малюнкі?» (мал. 5). Разглядаюцца і параўноўваюцца два малюнкі. Вучні адшукваюць і называюць адрозненні ў выявах адзення дзяўчынкі, парасона, вавёркі, лісця, травы.

На с. 13 буквара зменена ілюстрацыя для падагульнення атрыманых ведаў з апорай на схемы (мал. 6).



*Малюнак 5* — Заданне для гульні «Чым адрозніваюцца малюнкі?»



*Малюнак 6* — Заданне для падагульнення атрыманых ведаў з апорай на схемы

Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні паўтараюць вывучаны матэрыял, расказваюць, якія новыя веды пра слова набылі. Словы могуць называць прыметы прадметаў: *парасон (які?) чырвоны, парасон (які?) жоўты*. Словы могуць называць дзеянні прадметаў: *вавёрка (што робіць?) грызе (арэх), вавёрка (што робіць?) спіць*.

<u>Урок 8.</u> Гукі мовы. Выдзяленне гука ў слове.

На с. 19 буквара зменена ілюстрацыя для ўвядзення спосабу выдзялення гукаў ў слове (мал. 7).



*Малюнак 7* — Заданне для выдзялення гукаў у слове

Работа арганізуецца з апорай на малюнкі (*сыр, шар, мыш, сом*) і схемы для правядзення гукавога аналізу слоў. Настаўнік просіць разгледзець малюнкі і назваць прадметы: *сыр, шар, мыш, сом*. Звяртае ўвагу вучняў на схемы слоў і тлумачыць:

— Пад кожным малюнкам ёсць схемы слоў. Гэта нашы памочнікі. Кожны квадрат — гэта домік аднаго гука. Колькі квадратаў на схеме слова *сыр*? *(Тры квадраты.)* Колькі ўсяго домікаў для гукаў? *(Тры домікі.)* Значыць, колькі гукаў у гэтым слове? *(Тры гукі.)* Усё зразумела?

— Знайдзіце пад малюнкам схему слова *шар* (*мыш*). Колькі домікаў для гукаў? *(Тры домікі.)* Значыць, колькі гукаў у слове *шар* (*мыш*)? *(Тры гукі.)* Выдатна! Знайдзіце схему слова *сом*. Колькі гукаў у гэтым слове? *(Тры гукі.)* Чаму так вырашылі? *(На схеме тры домікі.)* Малайчыны!

Гукавы аналіз слоў *сыр, шар, мыш, сом* з выдзяленнем усіх гукаў.

<u>Урок 15.</u> Гукі [м], [м'], літара ***М/м***.

На с. 33 буквара зменена ілюстрацыя (мал. 8) для арганізацыі работы па развіцці звязнага




*Малюнак 8* — Заданне для развіцця звязнага маўлення і гульні «Расшыфруй схемы»

маўлення і гульні «Расшыфруй схемы». Вучні разглядаюць малюнак, вусна складаюць сказы, тэкст. Настаўнік прапануе даведацца, якія словы зашыфраваны ў схемах. Памочнікі вучняў — літары ***м***, ***с*** і ***л***. Гэта словы: *Мінск, метро, клумба*.

<u>Урок 21.</u> Гук [у], літара ***У/у***.

На с. 45 буквара зменена заданне для навучання чытанню слоў і сказаў (мал. 9). Педагог дае заданне прачытаць словы (*сум, мус*) і вызначыць, якім з іх можна падпісаць малюнкі. Пад кіраўніцтвам педагога вучні вызначаюць, што на першым малюнку дзяўчынка сумуе. Настаўнік тлумачыць, што пачуццё смутку, жалю можна назваць словам *сум*. Вучні знаходзяць і чытаюць гэтае слова. Педагог прапануе вучням самім растлумачыць сэнс другога слова (*мус*). Вучні чытаюць слова *сум* па стрэлках (злева направа і справа налева): *сум, мус*. Арганізуецца чытанне сказаў, гутарка па змесце малюнкаў і сказаў.




*Малюнак 9* — Заданне для навучання чытанню слоў і сказаў

<u>Урок 24.</u> Гукі [г], [г'], літара ***Г/г***.

На с. 50 буквара зменена ілюстрацыя (мал. 10) для выдзялення і характарыстыкі гукаў, якія вывучаюцца. Пад кіраўніцтвам настаўніка выдзяляюцца першыя гукі [г] і [г'] у словах *гном* і *гітара*. Вучні даказваюць, што гэта зычныя гукі (па спосабе ўтварэння). Працуюць з гукамі, прагаворваюць іх, слухаюць, супастаўляюць артыкуляцыю цвёрдага гука [г] і мяккага гука [г']. Вызначаюць, што зычны гук [г] — звонкі цвёрды, а зычны гук [г'] — звонкі мяккі.




*Малюнак 10* — Заданне для выдзялення гука [г]

З буквара (с. 50) выключана заданне для гульні «Знайдзі пару», уведзена новае заданне з рэбусам (мал. 11).

Настаўнік дапамагае вучням разгадаць рэбус:

— Прачытайце літару, змешчаную ў рэбусе. (Вучні чытаюць літару ***Г***, якая стаіць адна, без




*Малюнак 11* — Рэбус «грыбы»

камандзіра, вымаўляюць цвёрды гук [г].) Хто намаляваны пасля знака «плюс»? *(Рыбы.)* [г] + *рыбы* — атрымаецца… ? *(Грыбы.)* Які «прыклад» мы толькі што рашылі? *([г] + рыбы = грыбы.)* Хто з вас збіраў грыбы? Якія грыбы вы ведаеце?

<u>Урок 26.</u> Гукі [п], [п’], літара ***П/п***.

На с. 55 буквара зменены заданні для чытання слоў і сказаў з вывучанымі літарамі (мал. 12). Вучні чытаюць слупкі слоў, потым сказы. Асобныя словы вучні дагаворваюць з апорай на малюнкі. Настаўнік звяртае ўвагу, што розны націск у словах *палілá* і *палíла* змяняе значэнне гэтых слоў.

*Міла лілá* <u>*ваду*</u>. *Міла палілá* <u>*кветкі*</u>.

<u>*Баба-яга*</u> *палíла ў* <u>*печы*</u>.

Вучні разглядаюць на ілюстрацыі буквара Філіпку, галоўнага героя беларускай народнай казкі, чытаюць пытанне (*А Піліп?*). Каб даведацца, што здарылася з хлопчыкам, ці змог ён уцячы ад Бабы-ягі, настаўнік прапануе прагледзець праз QR-код мультфільм «Філіпка», які створаны Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм» па матывах беларускіх народных казак.




*Малюнак 12* — Заданні для чытання слоў і сказаў з вывучанымі літарамі

<u>Урок 41.</u> Гукі [й’а], літара ***Я/я***.

На с. 84 буквара зменены ілюстрацыі (мал. 13) для выдзялення і характарыстыкі гукаў, якія вывучаюцца, замацавання атрыманых ведаў.




*Малюнак 13* — Заданне для выдзялення гукаў [й’а]

Арганізуецца аналіз слоў з мэтай вызначэння пазіцыі гукаў, якія вывучаюцца, і праводзяцца назіранні за абазначэннем іх літарай ***я***:

— Што намалявана на першым (другім) малюнку? Якія гукі абазначаны літарай ***я*** ў слове? (Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка вымаўляюць словы, вылучаюць гукі [й’а].) Якое месца займаюць гукі [й’а] у слове? *(У слове «яблык» — у пачатку, у слове «баян» — пасля галоснага гука.)* Якая літара «працуе» для абазначэння гэтых гукаў у слове — маленькая ці вялікая? *(Маленькая.)*

На с. 85 буквара ўнесены змены ў змест тэксту «Гурток» і пытанні да яго, прапанавана новая ілюстрацыя.

<u>Урок 64.</u> Гук [д], літара ***Д/д***.

На с. 130 буквара зменена ілюстрацыя (мал. 14) для выдзялення і характарыстыкі гука, які вывучаецца. Пад кіраўніцтвам настаўніка выдзяляецца першы гук [д] у словах *дом* і *дрэва*. Вучні працуюць з гукам, прагаворваюць яго, слухаюць. Настаўнік тлумачыць, што пры вымаўленні гэтага гука паветра сустракае перашкоду ў роце. Чуецца голас і шум. Вучні вызначаюць, што гук [д] — зычны звонкі цвёрды.




*Малюнак 14* — Заданне для выдзялення гука [д]

<u>Урок 65.</u> Замацаванне вывучанага матэрыялу. Чытанне слоў з літарай ***Д***. Пазакласнае чытанне на тэму «Расцём добрымі, чулымі, клапатлівымі».

На с. 132 буквара зменена заданне для чытання сказаў і тэкстаў, развіцця маўлення (мал. 15).

Настаўнік арганізуе чытанне верша «Якія бываюць словы?»:




*Малюнак 15* — Заданне для чытання сказаў і тэкстаў, развіцця маўлення

— Выразна прачытайце назву верша. Які сказ вы толькі што прачыталі? *(Сказ-пытанне.)* Паспрабуйце даць адказ на гэта пытанне. (Выслухоўваюцца розныя меркаванні вучняў.)

— Паслухайце верш і скажыце, які адказ на гэтае пытанне дае аўтар верша. (Настаўнік чытае верш.) Якія бываюць словы па меркаванні аўтара? *(Родныя, мудрыя, смачныя, цікавыя, ветлівыя.)*

Арганізуецца гутарка па пытаннях і выбарачнае чытанне:

— Знайдзіце і прачытайце ў вершы родныя (мудрыя і г. д.) словы. Чаму аўтар лічыць гэтыя словы роднымі (мудрымі і г. д.)? А якія яшчэ словы вы назвалі б роднымі (мудрымі і г. д.)?

Адпрацоўка выразнага чытання верша (першы — чацвёрты радкі — з пачуццём любові, астатнія — з пачуццём радасці).

— Прачытайце пытанні Кірыліцы. Як бы вы адказалі на іх? Падумайце! (Прыгадваюцца словы ветлівасці, словы суцяшэння, словы з памяншальна-ласкальным адценнем.)

На ўроках навучання пісьму будуць выкарыстоўвацца дапрацаваныя вучэбныя дапаможнікі «**Пропісь 1**», «**Пропісь 2**», «**Пісьмо**». У названых вучэбных выданнях скарэкціраваны арыенціровачныя знакі, якія дапамагаюць выпрацоўваць навык пісьма: графічныя выдзяленні пачатку і напрамку пісьма; прыпынак для адпачынку і самакантролю. Перагледжаны і ўдасканалены змест некаторых заданняў. Павялічана колькасць слоў і сказаў для спісвання з друкаванага ўзору. Для арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў дадаткова прапанавана яшчэ адна старонка. Абноўлены асобныя ілюстрацыі і заданні.